**Водзыў**

на аўтарэферат дысертацыі
Косцінай Жанны Вячаславаўны
"Эстэтычны ідэал літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя",
прадстаўленай на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук
па спецыяльнасці 10.01.01 – беларуская літаратура

Змест аўтарэферата Ж. В. Косцінай адлюстроўвае мэты, задачы, асноўныя метадалагічныя пазіцыі і палажэнні дысертацыйнай працы. Лагічна абгрунтавана актуальнасць даследавання; акрэслена яго навізна, асабліва ў плане глыбокага аналізу заяўленай праблемы "з улікам канцэптуальнага ўзроўню, мастацкага свету, знешняй формы мастацкага твора" (с. 7). Гэта датычыць вызначэння ролі рамантычнай іроніі, эмоцыі як змястоўнага элемента, абгрунтавання месца і ролі духоўна-хрысціянскіх матываў, гісторыка-патрыятычнай тэматыкі. Акрамя таго, Ж. В. Косціна апелюе да такіх складнікаў эстэтычнага ідэалу, як раслінна-кветкавая сімволіка, нацыянальна каларытныя вобразы-локусы; выяўляе эстэтычнае значэнне "народных форм выяўлення нацыянальнага быцця" (с. 20), такіх, як песня, калыханка; казка і інш.

Матэрыял даследавання склалі мастацкія творы, дакументалістыка, крытычныя працы літаратуры Беларусі першай паловы XIX ст. (Ю. У. Нямцэвіча, А. Міцкевіча, Я. Ходзькі, А. Гарэцкага, Я. Чачота, Т. Зана, У. Сыракомлі, В. Каратынскага, В. Дуніна-Марцінкевіча, І. Ходзькі, Т. Лады-Заблоцкага, Ю. І. Крашэўскага і інш.). У працэсе даследавання Ж. В. Косціна сістэматызавала гэты багаты матэрыял з улікам абагульнення папярэдняга навуковага вопыту, звярнулася да перакладзеных польскамоўных тэкстаў; выкарыстала мэтазгодны методыка-метадалагічны інструментарый. Дасягненню пастаўленай мэты спрыяла вырашэнне шэрагу задач, логіка якога прасочваецца ў структуры дысертацыі, прад'яўленай у аўтарэфераце.

У цэлым змест аўтарэферата, агульная ацэнка актуалізаванай суіскальніцай праблемы дазваляюць сцвярджаць, што дысертацыя, прадстаўленая на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.01.01 – беларуская літаратура, з'яўляецца самастойным даследаваннем, якое характарызуецца актуальнасцю і навуковай навізной. Заключныя высновы пераконваюць у глыбокім асэнсаванні дысертанткай вылучанай праблемы і належным узроўні яе даследчыцкіх кампетэнцый.

Разам з тым, на нашу думку, асобныя пазіцыі гэтага змястоўнага даследавання патрабуюць удакладнення.

1. Суіскальніца сцвярджае, што "эмоцыя смутку… стварае трагічны пафас у творах патрыятычнай і грамадзянскай тэматыкі (Я. Аношка,

А. Міцкевіч, У. Сыракомля, В. Каратынскі)”(с. 15). ***А ці ўласціва творам гэтай тэматыкі эмоцыя радасці?***

2. У змесце аўтарэферата не разгорнуты тэзіс аб тым, што эстэтычная важкасць слова ў літаратуры рамантызму праяўлялася “не толькі ў тэксце, але ***і ў культурным кантэксце***” (с. 5).

3. На нашу думку, варта ўдакладніць і наступную выснову: “Для Я. Чачота рака Мышанка з’яўляецца сімвалам шчаслівага дзяцінства, ***а таксама хронікай яго землякоў-ліцвінаў***” (с. 16).

Адзначым, аднак, што гэта прыватныя заўвагі, якія ў цэлым не зніжаюць вартасці праробленай суіскальніцай працы.

На аснове тэксту аўтарэферата можна канстатаваць, што дысертацыйнае даследаванне “Эстэтычны ідэал літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя” выканана на належным навуковым узроўні, а яго аўтар Ж. В. Косціна заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.01.01 – беларуская літаратура.

Доктар філалагічных навук, дацэнт,
прафесар кафедры філалогіі
Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта А. І. Белая

Подпись Белой А.И. удостоверяю
Начальник ОДО Н.А. Лаун

Министерство образования Республики Беларусь
Учреждение образования «Барановичский государственный университет»
Брестская область, г. Барановичи
Отдел документационного обеспечения

Азнаёмлена
28.01.2025
Ж. В. Косціна

Водзыў паступіў у савет па абароне дысертацый Д 01.42.04
28.01.2025 г.
вучоны сакратар (Богдан А.Г.)